ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

Репозиторий БГПУ

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

Для вобразна-эмацыянальнага ўздзеяння на вучняў пры вывучэнні тэмы настаўнік можа выкарыстаць некаторыя мастацкія творы, напрыклад, цыкл вершаў Я. Купалы «Песні вайны», аповесці М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне», «Ціхая плынь» і інш.

У канцы ўрока праводзіцца кантроль засваення ведаў вучнямі па вывучанай тэме:

***1 узровень (1–2 балы):***

1. Прычынай Першай сусветнай вайны стала:
   а) абвастрэнне супярэчнасцяў паміж Расіяй і краінамі Захаду;
   б) аб'яднанне краін Захаду ў імперыялістычныя блокі;
   в) барацьба за перадзел свету паміж Антантай і Траістым саюзам.
2. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі пачынаюцца ў:
   а) 1914 г., б) 1915 г., в) 1916 г.

***2 узровень (3–4 балы):***

3. Дайце азначэнне паняццям: эвакуацыя, ваеннае становішча, акупацыя, пазіцыйная вайна

***3 узровень (5–6 балаў):***

4. Апішыце, як і чаму змянілася становішча насельніцтва Беларусі з пачаткам Першай сусветнай вайны.

***4 узровень (7–8 балаў):***

5. Параўнайце адносіны да Першай сусветнай вайны розных палітычных партый у Расіі і газеты «Наша ніва».

***5 узровень (9–10 балаў):***

6. Падумайце, чаму падчас нямецкай акупацыі Заходняй Беларусі Германія аддавала перавагу польскаму і літоўскаму нацыянальнаму руху перад беларускім?

## 4.9. Тэма «Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі»

Тэма гэтага ўрока займае асобае месца ў вывучэнні гісторыі Беларусі. Пры яе разглядзе маладыя грамадзяне нашай краіны зразумеюць, як сфарміраваўся беларускі народ і чаму ён атрымаў



сваю дзяржаўнасць. Правільная арганізацыя работы па вывучэнні гэтай тэмы будзе спрыяць фарміраванню нацыянальнай свядомасці, выхоўваць у вучняў павагу да беларускай культуры, выклікаць гонар за сваю Радзіму. Разгледзім некалькі магчымых варыянтаў правядзення ўрока па дадзенай тэме.

***1. Урок вывучэння новага вучэбнага матэрыялу***

На ўроку мэтазгодна выкарыстаць матэрыялы з беларускай літаратуры, народнай музыкі, этнаграфіі, што будзе садзейнічаць плённай працы вучняў. Улічваючы важнасць тэмы і вялікі аб'ём новага матэрыялу, увесь урок адводзіцца вывучэнню новага матэрыялу. Пры падрыхтоўцы да ўрока настаўнік прапануе вучням выкарыстаць вучэбны дапаможнік па гісторыі Беларусі, а таксама даведачную літаратуру і наглядныя дапаможнікі. На ўроку спатрэбяцца палітычная карта Рэспублікі Беларусь, «Этнографическая карта белорусского племени» Я. Карскага, карта-схема «Гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі», схема «Прыкметы нацыі».

***Мэта урока:*** арганізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць вучняў па вывучэнні заканамернага працэсу складвання беларускай нацыі і раскрыць умоў, у якіх адбывалася яе фарміраванне.

**Задачы урока**

1. ***Навучальная*** – пры арганізацыі работы школьнікаў у групах вызначыць прыкметы беларускай нацыі, прасачыць умовы і асаблівасці яе ўтварэння ў XIX ст.

2. ***Развіццёвая*** – садзейнічаць развіццю ў вучняў уменняў аналізаваць, параўноўваць, даваць ацэнку гістарычным падзеям і працэсам.

3. ***Выхаваўчая*** – стварыць умовы для выхавання ў вучняў нацыянальнай самасвядомасці, патрыятычных пачуццяў, павагі да свайго народа і яго гісторыі.

Пазнавальнай дзейнасцю вучні займаюцца ў чатырох або пяці групах, якія створаны загадзя. Кожная група займаецца вывучэннем аднаго з пытанняў плана ўрока ў адпаведнасці са зместам вучэбнага матэрыялу:

1 група – Этнічная тэрыторыя, нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва Беларусі.

2 група –Агульнасць гаспадарчага жыцця.



Репозиторий БГПУ